# УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЕСНІК

№ 9 (264) верасень 2019

Выдаецца з мая 1996 г. Перыядычнасць – 1 раз на месяц

Газета ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»


**Выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў шчыра віншуем з Днём універсітэта!!!**

**Жадаем поспехаў у працы і вучобе, выхаду на новыя ўзроўні, дасягненняў ва ўсіх спецыялізаваных галінах нашай установы!**

**Творчага даўгалецця, новых навуковых здзяйсненняў і адкрыццяў, цудоўных студэнтаў, прафесійных выпускнікоў, дастойнага працягу і развіцця слаўных традыцый універсітэта!**

**Геніяльных ідэй і іх лёгкай рэалізацыі, фінансавай незалежнасці і гордасці за прыналежнасць да нашага ўніверсітэта!**

**Шаноўныя педагогі! Віншуем вас са святам – Днём настаўніка!**

**Прафесія настаўніка спалучае ў сабе мудрасць і маладосць душы, крэатыўнасць і энергію, дабрыню і строгасць. Вашу працу неверагодна складана ацаніць: ёй проста няма цаны! Вы столькі сіл і здароўя ўкладваеце ў сваю справу, што часам адбіраеце сваю каштоўную ўвагу у родных і блізкіх. Ваша штодзённая дарога – гэта дарога да гарачых, прагных да жыцця сэрцаў, да няскораных вяршынь ведаў.**

**Жадаем вам здароўя і цярпення, спакою і гармоніі, разумення і павагі да кожнага з вас, здзяйснення мар і дасягнення пастаўленых мэт, адкрыццяў і перамог!**

**Няхай прызнанне і ўдзячнасць вашых студэнтаў стане для вас дастойнай узнагародай!**

## Віншуем!

Рэктарат і прафкам супрацоўнікаў універсітэта віншуюць з юбілеем **ШКУТКО Анжэлу Аляксандраўну, ГАПЕЕНКА Жанну Васільеўну, СТРОГАНАВА Аркадзя Антонавіча, ГАСЦЕВІЧ Таццяну Васільеўну, ФАЦІНА Сяргея Браніслававіча.**

Прыміце самыя шчырыя пажаданні здароўя, шчасця і дабрабыту! Хай працоўныя будні не прыносяць стомы, жыццё не пакіне непакораных вышынь, а наперадзе будуць новыя праекты і дасягненні!

# «Погляд на сучаснасць – крок у будучыню»: перапіс насельніцтва – 2019

***Пад лозунгам «Погляд на сучаснасць – крок у будучыню» ў Рэспубліцы Беларусь пройдзе чарговы перапіс насельніцтва. Перапіс праводзіцца адзін раз на 10 год, у гэтым годзе ён арганізаваны з 4 па 30 кастрычніка. У якасці валанцёраў на перапісе будуць працаваць болей за 100 студэнтаў і 5 выкладчыкаў нашага ўніверсітэта.***

Перапіс пройдзе традыцыйна, з тым толькі адрозненнем ад папярэдніх, што ў нашых грамадзян будзе магчымасць самастойна і ў зручны для сябе час запоўніць апытальныя лісты праз інтэрнэт, а таксама на стацыянарных перапісных участках, або дома з дапамогай перапісчыка.

Усеагульнае апытанне насельніцтва пройдзе ў тры этапы.

**Этап першы** – з 4 па 18 кастрычніка 2019 г.

Вам даецца магчымасць самастойна запоўніць перапісныя лісты з дапамогай спецыяльнай праграмы ў сетцы інтэрнэт або прыйсці на стацыянарны ўчастак і паведаміць інфармацыю пра сябе. Перапіс праз інтэрнэт – гэта хуткі і зручны спосаб. Вы зможаце запаўняць апытальны ліст у любым месцы, дзе ёсць інтэрнэт (дома, у кафэ, у грамадскім транспарце). Вам не трэба нікому агучваць інфармацыю пра сябе і вас ніхто не прыспешвае сваім чаканнем.

Інфармацыя пра тое, як ажыццяўляць уваход у праграму і карыстацца ёю, будзе даведзена на інфармацыйных улётках, у жыроўках, у СМІ.

Анкета складзена такім чынам, што інфармацыя прадастаўляецца аб усіх членах хатняй гаспадаркі (сям'і), якія пражываюць сумесна. Персанальныя даныя аб непаўналетніх дзецях паведамляюцца іх бацькамі (апекунамі, папячыцелямі), або паўналетнімі членамі хатняй гаспадаркі.

Можна перапісаць у сетцы інтэрнэт таксама сваіх пажылых сваякоў, бабуль і дзядуль. У такім выпадку ім не трэба будзе чакаць перапісчыка дома і адчыняць дзверы незнаёмым людзям.

Перапісныя ўчасткі будуць працаваць штодня з 9.00 да 21.00 увесь перыяд перапісу (з 4 па 30 кастрычніка).

**Этап другі** – пройдзе з 19 па 20 кастрычніка 2019 г.

У гэты перыяд будзе ажыццяўляцца падлік рэспандэнтаў, якія перапісаліся праз сетку інтэрнэт. Адрасы перапісаных рэспандэнтаў і сваякоў, перапісаных вамі, будуць выключаны з пераліку для наведвання перапісчыкамі. У гэты перыяд таксама працягнецца перапіс на стацыянарных участках (штодня з 9.00 да 21.00).

**Этап трэці** – пройдзе з 21 па 30 кастрычніка 2019 г.

Перапісчыкі будуць праводзіць апытанне рэспандэнтаў па месцы жыхарства (знаходжання) і на стацыянарных участках.

Пры правядзенні апытання насельніцтва перапісчык абавязаны прад'явіць спецыяльнае пасведчанне і пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Таксама ён будзе мець сумку з лагатыпам перапісу і планшэт. Перапіс насельніцтва не ажыццяўляецца па каналах тэлефоннай сувязі, таму, калі вам патэлефанавалі і прадставіліся асобай, якая ажыццяўляе перапіс, ведайце – гэта махляр. І ўжо ні ў якім разе не перадавайце такім асобам інфармацыю аб вашых банкаўскіх картках і інш.

Вы зможаце скараціць час вуснага апытання, калі назавеце перапісчыку свой ідэнтыфікацыйны нумар. Гэта дазволіць паскорыць працэс запаўнення перапіснога ліста за кошт загрузкі наяўных даных з рэгістра насельніцтва: прозвішча, імя, імя па бацьку, даты і месца нараджэння, полу, грамадзянства (подданства), месца жыхарства і (або) месца знаходжання.

Па заканчэнні апытання перапісчыкам даныя пра вас перадаюцца па абароненаму каналу сувязі на сервер Белстата і аўтаматычна выдаляюцца з планшэтнага камп'ютара.

Перапісчык не мае доступу да захаванай інфармацыі, не можа яе праглядаць або рэдагаваць пасля завяршэння апытання.

Большая частка перапісчыкаў – гэта студэнты, якія будуць праводзіць працу цалкам бясплатна. Будзьце ветлівыя адзін да аднаго! Сярод гэтых маладых людзей – вашы дзеці, унукі, знаёмыя. Праявіце грамадзянскую свядомасць!

Усяго вам будзе зададзена 49 пытанняў (на перапісе 2009 года было 37). Ад перапісу да перапісу нязменнымі застаюцца наступныя пытанні: дата нараджэння; пол; родасныя адносіны (жонка, муж, дачка і г. д.); сямейнае становішча; месца нараджэння; бесперапыннасць пражывання ў населеным пункце; пражыванне 1 год і больш у другой краіне; грамадзянства; нацыянальнасць (этнічная прыналежнасць); родная мова; мова, на якой звычайна размаўляюць дома; узровень (ступень) адукацыі; атрыманне адукацыі; крыніцы сродкаў існавання; праца ў апошні тыдзень да пачатку перапісу; планаванне нараджэння дзяцей (толькі для жанчын ва ўзросце 18-49 гадоў).

Пры адказах на ўсе пытанні не патрабуецца дакументальнае пацвярджэнне, і чалавек вызначаецца самастойна, як адказаць.

Упершыню нам прапануюць адказаць на пытанні аб сельскагаспадарчай дзейнасці (зямельныя плошчы, пасевы, пагалоўе жывёлы і птушкі). Гэта агульнасусветная практыка.

Апытанне аб сельскагаспадарчай дзейнасці – самае поўнае і аб'ектыўнае даследаванне аграрных рэсурсаў краіны, якое дазваляе атрымаць адказ на пытанне: «Якімі рэсурсамі валодаюць хатнія гаспадаркі?» На аснове, у тым ліку і гэтых, даных будуць распрацоўвацца дзяржаўныя праграмы развіцця сельскай гаспадаркі.

Усе даныя, прадастаўленыя вамі ў ходзе перапісу, з'яўляюцца канфідэнцыйнымі і не падлягаюць перадачы ў падатковыя і іншыя дзяржаўныя органы, а таксама трэцім асобам.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2006 г. №144-з «Аб перапісе насельніцтва» прадугледжана адказнасць за захаванасць інфармацыі і іншыя парушэнні заканадаўства аб перапісе.

Кожны павінен праяўляць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю. Без дакладнай інфармацыі аб тым, хто мы і якія мы, колькі нас, немагчыма фарміраванне планаў будаўніцтва бальніц, школ, іншых сацыяльных аб'ектаў!

Вынікі перапісу стануць асновай для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў у эканамічнай і сацыяльнай галінах жыцця краіны, будуць выкарыстаны пры фарміраванні рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, размеркаванні фінансаў на пенсійнае забеспячэнне, медыцыну, адукацыю, жыллёва-камунальную гаспадарку і іншыя сферы.

Будзем памятаць: сёння фарміруецца наш заўтрашні дзень!

**Падрыхтавала В. М. ШАРШНЁВА, паводле афіцыйных матэрыялаў.**

# ИТОГИ ПРИЕМНОЙ КАМПАНИИ

***В 2019 году прием заявлений от абитуриентов на первую ступень получения образования по дневной форме с полным сроком обучения производился по 21 специальности, по заочной форме получения образования – по 9 (по 4 специальностям набирали как на полный, так и на сокращенный срок обучения). План приема этого года составил: дневная форма получения образования – 581 человек (из них 310 – за счет средств республиканского бюджета); заочная форма получения образования – 339 человек (из них 134 – бюджетные места).***

План приема на обучение за счет средств республиканского бюджета выполнен полностью. Уже второй год подряд наш университет добивается этого без объявления дополнительного набора. Главная заслуга в этом достижении – слаженная работа факультетов и лично деканов.

Однако план приема на обучение на платной основе не выполнен – 242 студента были зачислены на дневную форму получения образования (89,3% от плана) и 203 – на заочную (99% от плана). Традиционно в лидерах по выполнению плана набора оказались три факультета (они выполнили план на 100%): факультеты иностранных языков, педагогики и психологии детства и физического воспитания.

Наибольший конкурс и наивысшие проходные баллы на бюджетную форму по специальностям дневной формы получения образования (кроме традиционных специальностей «Правоведение» и «Экономическое право», где утверждено малое количество бюджетных мест) был отмечен на специальностях «Романо-германская филология» (Английский язык и литература. Немецкий язык) – 321, «Романо-германская филология» (Английский язык и литература. Французский язык) – 319 (4 человека на место), «Логопедия» – 293 балла (2,5 человека на место), «Психология» – 290 баллов (2,8 человека на место), «Физическая культура» – 271 балл (2,8 человека на место). Наибольший конкурс среди специальностей на обучение в дневной форме получения образования на платной основе – на специальности «Романо-германская филология» (Английский язык и литература. Немецкий язык)» – 1,3 человека на место и «Правоведение» – 1,4 человека на место.

Наибольший конкурс и наивысшие проходные баллы по специальностям заочной формы получения образования на бюджетную форму отмечены на специальностях «Физическая культура» – 233 (2,6 человека на место), «Логопедия» – 224 балла (3,1 человека на место). Активно подают документы абитуриенты и на специальности, обеспечивающие получение высшего образования в сокращенные сроки, особенно на специальности «Дошкольное образование» – 2,1 человека на место и «Физическая культура» – 1,6 человека на место.

В целом по университету средний конкурс составил:

на дневную форму получения образования

✓ за счет средств республиканского бюджета – 1,8 человека на 1 место;

✓ на платной основе – 0,95 человека на 1 место;

на заочную форму получения образования

✓ за счет средств республиканского бюджета – 1,9 человека на 1 место;

✓ на платной основе – 1,8 человека на 1 место.

Наибольшее число зачисленных на 1 курс – абитуриенты из Могилева и Могилевской области (446 и 262 человека соответственно). Далее следует Гомельская, Минская, Витебская области. По области наибольшее число поступивших – из Бобруйска и Бобруйского района.

Без вступительных испытаний в университет зачислены:

**на дневную форму получения образования – 32 человека.**

22 – выпускники профильных классов педагогической направленности (в прошлом году – 18);



3 – призеры республиканских олимпиад (1 – история, 2 – физическая культура);

7 – закончившие учреждения общего среднего образования, среднего специального образования с золотой или серебряной медалью или дипломом с отличием на педагогические специальности по рекомендации педсоветов;

**на заочную форму получения образования – 22 человека**

11 – закончившие учреждения среднего специального образования с дипломом с отличием;

11 – победители и призеры чемпионатов, финалов розыгрышей кубков, первенств мира и Европы, чемпионатов Республики Беларусь.

Набор в магистратуру по сравнению с 2018 годом уменьшился, что связано, в первую очередь, с изменением подходов министерства образования по формированию контрольных цифр приема на вторую ступень образования. Утвержденные контрольные цифры приема в магистратуру также выполнены полностью.

Прием осуществлялся на специальности: «Физическая культура и спорт», «Литературоведение», «Языкознание», «История», «Психология», «Юриспруденция». Наибольшее число абитуриентов зачислено на специальность «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» – 29 человек на дневную форму обучения и 18 человек на заочную форму, в том числе 2 человека за оплату.

Безусловно, успешное проведение приемной кампании и выполнение плана приема зависит не только от слаженной работы сотрудников приемной комиссии университета, но от целенаправленной профориентационной работы на факультетах и кафедрах в течение года. Прием – это уже определенный итог нашей работы с абитуриентами.

**Д.А. Лавшук, доцент кафедры теории и методики физического воспитания, ответственный секретарь приемной комиссии.**

# ГІСТОРЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

85 ГАДОЎ

***2019 год з'яўляецца юбілейным для гісторыка-філалагічнага факультэта: выкладчыкі і студэнты адзначаюць 85-годдзе з пачатку падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў і філолагаў у Магілёўскім педагагічным інстытуце.***

У Расійскай імперыі існавалі разнастайныя спосабы атрымання звання настаўнікаў. Многія педагогі мелі духоўна-рэлігійную адукацыю і былі асобамі духоўнага звання. Настаўнікаў для народных школ Беларусі рыхтавалі ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі, у Магілёўскай духоўнай семінарыі. У Магілёве, Мсціславе, Гомелі і Оршы дзейнічалі павятовыя духоўныя вучэльні, многія гадаванцы якіх настаўнічалі. У Магілёве з 1778 г. дзейнічала каталіцкая семінарыя, якая рыхтавала манахаў – выкладчыкаў для школ. Дыяцэзія мела і акадэмію, якая (семінарыя з 1847, акадэмія з 1882) размяшчалася ў Санкт-Пецярбургу. Семінарыя адкрывалася і ў Мсціславе.


Будынак Магілёўскага пединстытута. Пач. XX ст.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта па меры росту сеткі школ узмацнялася праблема дэфіцыту падрыхтаваных кадраў настаўнікаў. Для магілёўскіх школ педагогаў рыхтавалі ў Пецярбургскім педагагічным інстытуце, Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце. У другой палове XIX ст. на беларускіх землях дадаткова былі адкрыты чатыры настаўніцкія семінарыі: Маладзечанская, Полацкая, Нясвіжская, Свіслацкая. Полацкая рыхтавала настаўнікаў для Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Заканчэнне гімназій таксама давала магчымасць стаць настаўнікам. У канцы XIX ст. на беларускіх землях працавала сем мужчынскіх гімназій, у іх ліку Магілёўская і Гомельская, дзве прагімназіі, у тым ліку Бабруйская. У 1906 г. была адкрыта мужчынская гімназія ў Мсціславе.

У пачатку XX ст. школа дынамічна развівалася і назіраўся востры недахоп кваліфікаваных настаўнікаў. На тэрыторыі Беларусі былі адкрыты яшчэ пяць настаўніцкіх семінарый: мужчынская ў Рагачове, жаночыя ў Барысаве, Оршы, Гомелі і Бабруйску. У 1910 г. настаўнікаў для школ, у тым ліку і Магілёўскай губерні, стаў рыхтаваць Віцебскі настаўніцкі інстытут, а з 1913 па 1918 г. – Магілёўскі настаўніцкі інстытут.

Ва ўсіх пералічаных навучальных установах выкладаліся прадметы гістарычнага цыкла, але спецыялізаваная падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі на тэрыторыі Магілёўскай губерні адсутнічала. Настаўнікаў гісторыі з вышэйшай адукацыяй рыхтавалі ўніверсітэты метраполіі, перш наперш, Пецярбургскі і Маскоўскі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў снежні 1918 г. Магілёўскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны інстытут — вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Настаўнікаў для школ другой ступені вучылі на фізіка-матэматычным, сацыяльна-гістарычным, біялагічным, літаратурна-мастацкім і геаграфічным цыклах. У 1919 г. педагагічныя інстытуты пераўтварыліся ў інстытуты народнай адукацыі, а ў 1921 г. яны былі пераўтвораны ў практычныя інстытуты народнай адукацыі. Востры сацыяльна-эканамічны крызіс пасля Грамадзянскай вайны прывёў да закрыцця ў 1923 г. інстытута, які перадаў сваю матэрыяльную базу педагагічнаму тэхнікуму.

У 1930 г. было прынята рашэнне аб аднаўленні педагагічнага інстытута ў Магілёве, які з 1 кастрычніка 1930 г. распачаў сваю дзейнасць. У 1934 г. было прынята рашэнне аб пераўтварэнні аддзяленняў інстытута ў профільныя факультэты з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Такіх напачатку было ўтворана тры: гістарычны, геаграфічны, мовы і літаратуры з рускім і беларускім аддзяленнямі. Такім чынам, з 1934 г. пачалася падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі з вышэйшай адукацыяй на гістарычным факультэце.

Па меры росту колькасці студэнтаў абвастрылася праблема недахопу кваліфікаваных кадраў выкладчыкаў. Яе ўзмацнілі рэпрэсіі студэнтаў і выкладчыкаў усіх факультэтаў, якія прывялі да таго, што ў 1935 г. востра не хапала, а ў 1936-1938 гг. практычна не засталося сваіх лектараў-гісторыкаў. З-за знішчэння "шкодніцкіх кніг ворагаў народа" катастрафічна не хапала гістарычнай літаратуры. Меліся праблемы з наборам студэнтаў. Тым не менш, праблемы, якія ўзнікалі, паступова вырашаліся. Факультэт да канца 1930 – пачатку 1940 гг. перабудоўваў сваю працу ў адпаведнасці з прынятымі партыйнымі і дзяржаўнымі дакументамі.

У 1937 г. пры педагагічным ствараецца настаўніцкі інстытут з двухгадовым тэрмінам навучання, які рыхтаваў настаўнікаў, у тым ліку гісторыкаў, для няпоўнай


Студэнты гістарычнага факультэта. 1930-я гг.

сярэдняй школы, а ў наступным годзе была адкрыта аспірантура.

Прыпыніліся заняткі на гістарычным факультэце ў чэрвені 1941 г. З супрацоўнікаў Магілёўскага педагагічнага інстытута і педагагічнага вучылішча быў сфармаваны атрад народнага апалчэння, які вызначыўся пры абароне горада. Многія выкладчыкі і студэнты ВНУ прымалі актыўны ўдзел у ваенных дзеяннях на франтах і ў партызанскіх атрадах. Героем Савецкага Саюза стаў студэнт інстытута Дзмітрый Жмуроўскі, у далейшым – доктар гістарычных навук, прафесар БДУ.

Праз месяц пасля вызвалення Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г. інстытут аднавіў сваю дзейнасць. Адным з трох адноўленых факультэтаў быў гістарычны. Адрадзілася і гісторыка-філалагічнае аддзяленне пры настаўніцкім інстытуце, якое з 1945/1946 навучальнага года было падзелена на два самастойныя аддзяленні – гістарычнае і аддзяленне літаратуры і мовы. Падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі працягвалася і на завочнай форме навучання.

Вялікая ўвага да гістарычнай адукацыі ў інстытутах была выклікана тым, што на настаўнікаў была ўскладзена функцыя ўпаўнаважанага сацыялістычнай дзяржавы – праваднiка палітыкі партыі ў сферы духоўнага жыцця і ідэалогіі, а на настаўніка гісторыі – яго непасрэднага праваднiка. Гісторыкі былі абцяжараны шматлікімі грамадскімі абавязкамі, даручэннямі, удзелам у агітацыйна-масавых мерапрыемствах. З педагогаў гісторыкаў у значнай часткі фарміраваліся кадры кіравання сістэмай народнай адукацыі, розныя катэгорыі вызваленых партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх работнікаў.

Значэнне падрыхтоўкі гісторыкаў у Магілёве вырасла ў маштабе БССР у сувязі з закрыццём гістарычнага факультэта ў Віцебскім педагагічным інстытуце ў 1955 г. Студэнты 3-га і 4-га курсаў дзённага аддзялення і аддзялення завочнага навучання былі пераведзены з Віцебска на гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. З верасня 1956 г. гісторыя КПСС пачала выкладацца ў Магілёўскім педагагічным інстытуце як асобная вучэбная дысцыпліна. Яна ўключалася ў вучэбныя планы ўсіх факультэтаў і чыталася выкладчыкамі кафедры марксізму-ленінізму.

У 1956 г. гістарычны і геаграфічны факультэты былі аб'яднаны і пераведзены на пяцігадовы тэрмін навучання, які зноў быў пераведзены з пяцігадовага на чатырохгадовы з новага прыёму 1964 г. У лютым 1967 г. адбылася новая рэарганізацыя: на базе гісторыка-геаграфічнага ўтварыліся два факультэты – гістарычны і геаграфічны.

Па ініцыятыве дацэнта Гаўрылы Іонэ ў 1964 г. быў створаны археалагічны студэнцкі гурток. У 1973 г. на базе гістарычнага факультэта Магілёўскага пединстытута адбылася пятая рэгіянальная канферэнцыя ВНУ Паўночнага Захаду і цэнтральных абласцей СССР з актыўным удзелам выкладчыкаў і студэнтаў гістфака.

Лагічным вынікам развіцця навучальнай установы стала пераўтварэнне 30 чэрвеня 1997 г. педагагічнага інстытута ва ўніверсітэт. У 2014 г. прайшла цырымонія падпісання дамовы аб супрацоўніцтве паміж гістарычнымі факультэтамі МДУ імя А.А. Куляшова і МДУ імя М.В. Ламаносава.

Магілёўскі пединстытут, а затым універсітэт за гады свайго існавання падрыхтаваў каля 50 тысяч спецыялістаў пераважна для галіны народнай асветы. Сярод выбітных выпускнікоў-гісторыкаў мноства педагогаў, заслужаных настаўнікаў і выдатнікаў асветы Рэспублікі Беларусь, навукоўцаў, дзяржаўных дзеячоў: Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р.Лукашэнка, Герой Савецкага Саюза Д. Жмуроўскі, Герой Сацыялістычнай Працы М. Зімянін, члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ніна Каменская і Ігар Марзалюк.


Прафесары П.Ф. Дзмітрачкоў і П.Р. Лук'янаў ля галерэі кіраўнікоў універсітэта

# ЦІКАВЫЯ ЗНАХОДКІ ВАКОЛ НАС

***Пасля рашэння аб стварэнні ў 1990 г. Музея гісторыі Магілёва востра ўстала пытанне аб паскораным фарміраванні асноўнага, навукова-дапаможнага і іншых фондаў музея. У фарміраванні яго фондаў прынялі ўдзел выкладчыкі і супрацоўнікі Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А.А. Куляшова: Алег Дзячэнка, Пётр Лярскі, Віктар Старасценка, Ігар Шаруха і інш., а таксама некалькі пакаленняў студэнтаў-гісторыкаў.***

Найбольшая колькасць экспанатаў музею гісторыі Магілёва была перададзена археолагамі пасля правядзення шматгадовых археалагічных раскопак, у якіх непасрэдны ўдзел прымалі студэнты-гісторыкі пад час правядзення летніх палявых практык.


Ратуша – будынак Музея гісторыі Магілёва

Адсутнасць у музеі гісторыі Магілёва, а таксама ў музейных экспазіцыях МДУ імя А.А. Куляшова многіх прадметаў штодзённага побыту дало падставы выкладчыкам гістарычнага факультэта падчас правядзення летніх этнаграфічных, гісторыка-краязнаўчых, архіўна-музейных практык сабраць, а затым перадаць у музей вялікую колькасць экспанатаў. Паступова сталі зразумелымі пазнавальныя, вучэбныя і выхаваўчыя магчымасці, якія адкрывала такога роду збіральніцкая дзейнасць, выкрышталізоўваліся вучэбна-метадычныя падыходы да яе арганізацыі.

У межах курса "Краязнаўства і этналогія Беларусі" студэнты ўдзельнічалі ў пошуку прадметаў штодзённага ўжывання, якія фіксаваліся ў адпаведнасці з алгарытмам апісання музейных прадметаў, якія праз некалькі гадоў сталі афармляцца як паўнавартасныя вучэбна-даследчыя студэнцкія праекты. Варта заўважыць, што большасць студэнтаў, як і большасць жыхароў нашай краіны, былі ўпэўнены, што ў іх няма вартых музеяў прадметаў. Менавіта змена светапогляду на прадметны свет вакол іх, усведамленне яго каштоўнасці для сённяшняга і будучых пакаленняў і былі аднымі з галоўных задач гэтай праектнай дзейнасці.

З самага пачатку перад студэнтамі ставіліся пэўныя абмежаванні ў сферы пошуку прадметаў. Так, забаранялася прыносіць прадметы антыкварыяту, іконы, грашовыя знакі, прадметы, якія маюць каштоўныя металы і іншыя адносна дарагія прадметы. У дадатак да гэтага студэнтам тлумачылася важнасць захоўвання сямейных рэліквій у сем'ях для будучых пакаленняў роду. Рэчы ў музеі перадаваліся бясплатна, студэнты за выкананне праектаў атрымоўвалі звычайныя адзнакі, як за выкананне іншых вучэбных заданняў – напісанне рэфератаў, выступленне з дакладамі і г.д.

Паралельна студэнты пад нашым кіраўніцтвам распрацоўвалі індывідуальныя даследчыя праекты па папулярызацыі, мемарыялізацыі, ахове або выкарыстанні аб'ектаў гісторыі і культуры па тэме "Ахова і выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны" ў межах курсу "Краязнаўства і этналогія Беларусі". Слайд-прэзентацыі студэнцкіх праектаў публічна абмяркоўваліся на семінарскіх занятках і адкрытым пасяджэнні факультэцкага савета навукова-даследчага таварыства студэнтаў гістфака. Найлепшыя, на погляд студэнтаў, прапановы адсылаліся ў адпаведныя органы ўлады, установы культуры, што спрыяла актуалізацыі пытанняў па іх ахове і выкарыстанні.

Першыя прадметы былі здадзены ў музей гісторыі Магілёва з нашай дапамогай у 1994 г. У красавіку намі быў перададзены першы экзэмпляр пачатковага нумара часопіса "Магілёўская даўніна" з аўтографамі ўсіх аўтараў нумара, а другім прадметам стала сякера XVIII – пачатку XIX ст. Яна была знойдзена нашым сынам Арцёмам падчас сямейнага шпацыру ў красавіку 1994 г. у Падміколле. Гэтыя першыя музейныя прадметы падказалі, што цікавыя знаходкі існуюць вакол нас.

З 1996 г. мы пачалі арганізоўваць экспедыцыйныя выхады ў розныя рэгіёны Магілёўскай вобласці для збору інфармацыі аб штодзённым жыцці насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны, падчас якіх паралельна займаліся зборам прадметаў сялянскага побыту.

Найбольш шчодрым на знаходкі выдаўся 1999 г., які прынёс 123 прадметы. Асаблівую цікавасць выклікала фарфоравае фабрычнае блюда (32,7 х 3 см.) канца XIX – пачатку XX ст. з клеймамі "Германія", "По заказу Торг. Дома Кунстъ и


У залах музея

Альберсъ". Нічым не адметнае ў антыкварным сэнсе, яно да таго ж было пабіта і складалася з чатырох частак, якія былі склеены і замацаваны 17-ю металічнымі скобамі, што выклікала пытанні аб мэтазгоднасці такіх работ. Дадатковае апытанне перадатчыка выявіла, што нявеста ў адпаведнасці з традыцыяй наўмысна разбівала блюда на вяселлі, а гаспадар яго аднаўляў і захоўваў. Блюда з'яўлялася сямейным абярэгам і сімвалізавала трываласць сям'і, у якой могуць быць спрэчкі, сваркі ці нават бойкі, але сям'я павінна захоўвацца нягледзячы на ўсе выпрабаванні.

У 2001 г. мы паспрыялі перадачы калекцыі кніг нямецкай бібліятэцы вермафхта з Магілёўскага абласнога дзяржаўнага архіва ў колькасці 67 кніг, а ў 2002 г. – 62 антысавецкіх брашур, улётак, часопісаў ваеннага часу.

Супраца з універсітэтам дапамагла ў 2003 г. музею займець цікавую калекцыю дакументаў і кніг сям'і Якаўлевых. Яна была перададзена дзякуючы былой студэнтцы-завочніцы, якая працавала ў вучылішчы швейнікаў майстрам вытворчага навучання, а ў свой час выконвала заданне па пошуку прадметаў. Досвед той дзейнасці дапамог ёй, калі яна даведалася аб рукапісных кнігах, якія пыліліся на гарышчы сям'і навучэнкі з яе групы. Былая гістфакаўка выйшла на нас, а затым паспрыяла перадачы ўнікальных дакументаў і кніг у музей. Усяго было перададзена 7 прадметаў, найбольш каштоўнымі былі рукапісныя "Записки судебной медицины по лекциям Ординарного Профессора Е.В. Пеликана» 1836 г.

Надзвычайнай удачай стала перадача 19 асабістых рэчаў і фотаздымкаў, звязаных з жыццём і творчасцю кінарэжысёра Віктара Турава, са сваякамі якога мне давялося пазнаёміцца на цырымоніі пахавання народнага пісьменніка Васіля Быкава.

Так, у 2014 г. намі была перададзена адна, але надзвычай важная


Экспанаты музея

знаходка. Пад час штогадовай валанцёрскай акцыі "Зберажом Палыкавіцкую крыніцу" студэнтаў гістарычнага факультэта па ачыстцы тэрыторыі вакол крыніцы ад смецця Аляксандр Белавусаў – старшыня праваслаўнага "Прыходу Вялікапакутніцы Параскевы" – у знак падзякі пачаставаў студэнтаў і выкладчыкаў бярозавым сокам і паказаў "жалязяку" знойдзеную ў пяску, які быў намыты земснарадам з рэчышча Дняпра. Прадмет быў перададзены мне, а затым ідэнтыфікаваны археолагам Ігарам Марзалюком як каштоўная сякера (19 х 11 см) канца X–XII ст. з рэшткай аўтэнтычнага дубовага дрэўка (11 см).

Усяго аўтарам артыкула і студэнтамі гістарычнага факультэта было сабрана, а затым перададзена ў музей гісторыі Магілёва больш за 800 прадметаў. Варта дадаць, што ў 2017 і ў 2019 гг. намі перададзена ў музей і знаходзіцца ў стадыі афармлення яшчэ каля 60 кніг, 90 фотаздымкаў, 10 грампласцінак, 4 шкляных прадметы, сярод якіх каштоўная бутэлька з фігурнага шкла "Янікъ", 4 фотаапараты, 1 ліхтар, ёлачныя ўпрыгожванні, некалькі мабільных тэлефонаў і некаторыя іншыя разнастайныя прадметы. Разам каля 180 прадметаў. Такім чынам, агульная колькасць перададзеных рэчаў павінна складаць больш за 1 000 музейных прадметаў.

Фактычна гэты тэкст з'яўляецца не толькі абагульненнем збіральніцкай працы студэнтаў-гісторыкаў, супрацоўніцтва музея гісторыі Магілёва і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, але і данінай удзячнасці пакаленням студэнтаў-гісторыкаў, якія прынялі ўдзел у фарміраванні калекцый магілёўскіх музеяў.

Такая дзейнасць выхоўвае ў моладзі паважлівае стаўленне да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, спрыяе яе ахове і назапашванню, фарміруе ў студэнтаў навыкі супрацоўніцтва з музеямі краіны.

**А.Р. АГЕЕЎ,**
**прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.**

# Играл в футбол, а стал музыкантом!

***Магистрант факультета начального и музыкального образования, домрист, участник многочисленных музыкальных конкурсов Глеб Старовойтов рассказал нам о том, как он выбирал инструмент, на котором будет играть, о казусах во время выступлений и как он решает творческие конфликты.***


*Г.Старовойтов*

**– С чего началось твое увлечение музыкой?**

– Родители в детстве постоянно водили меня по каким-то интересным местам, на кружки. Изначально я занимался футболом где-то с 6 до 8 лет, пока однажды в 3 классе у меня спросили: хочешь музыкой заниматься? Этого я совсем не ожидал, но моя мама была очень уверена в том, что я должен захотеть заниматься музыкой. Мы с ней пришли в музыкальный колледж, мне показали несколько инструментов, и я понял, что здесь я надолго.

**– А как ты выбрал свой инструмент?**

– Мое первое впечатление было неоднозначным: ну ложка и ложка. Но что-то в ней было необычное, особенное, что заставило меня без лишних вопросов выбрать именно домру. Потом я сходил на вступительные экзамены, и с этого момента все закрутилось.

**– Каким, по твоему мнению, должен быть хороший музыкант?**

– Нужно очень много трудиться, чтобы стать действительно профессионалом в своем деле. Сейчас многие идут в музыку, потому что думают, что это легко. На самом деле все не так просто. Вообще, чтобы чего-то добиться, в тебе должна быть уверенность, процентов 90, иначе это плохо кончится. Если ты в себя не веришь, то у тебя нет стимула и желания добиваться, ведь любой путь к успеху лежит через пробы и ошибки. Но если ты в себя веришь, то ты ошибаешься и идешь дальше. Всегда нужно идти до конца.

**– Каждый ли человек может заниматься музыкой?**

